# Рух "За Свабоду" зарэгістраваны!

Міністэрства юстыцыі зарэгістравала Праваабарончаасветніцкае грамадскае аб'яднанне "Рух "За Свабоду". Нагадаем, заснавальнікі Праваабарончаасветніцкага грамадскага аб'яднання "Рух "За Свабоду" падавалі дакументы на рэгістрацыю арганізацыі чатыры разы. Кіраўніком ПАГА "Рух "За Свабоду" з'яўляецца Аляксандр Мілінкевіч.

№41
СЬНЕЖАНЬ 2008

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Рыгор КАСТУСЁЎ — новы старшыня Каардынацыйнай Рады дэмакратычных сіл вобласці



У першай палове снежня ў Магілёве адбылося паседжанне Каардынацыйнай Рады Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сіл. Нагадаю, што новы склад Рады агульнай колькасцю чатырнаццаць чалавек быў абраны патаемным галасаваннем на прайшоўшай 16 лістапада канферэнцыі дэмакратычных сіл нашай вобласці.

На паседжанні быў абраны выканкам Рады у складзе пяці чалавек. Старшынёй Каардынацыйнай Рады дэмакратычных сіл вобласці шляхам патаемнага галасавання выбраны Рыгор Кастусёў, яго намесьнікам — Юрый Новікаў (на здымку — злева). З улікам асабістых пажаданняў былі размеркаваны накірункі дзейнасці паміж сябрамі Каардынацыйнай Рады.

Рыгор Андрэевіч Кастусёў нарадзіўся ў 1957 годзе ў вёсцы Цяхцін Бялыніцкага раёна. З 2002 года з'яўляецца старшынёй Магілёўскай абласной арганізацыі партыі БНФ. На мінулых выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу быў кандыдатам у дэпутаты па Шклоўскай выбарчай акрузе № 90. Папярэднікам Рыгора Кастусёва на пасадзе старшыні Каардынацыйнай Рады быў дацэнт Магілёўскага ўніверсітэта харчавання Пётр Мігурскі.

Пасля працяглага абмеркавання на паседжанні прынята рашэнне аб стварэнні "Грамадзкага камітэта "Народны кантроль" па аказанню садзейнічання ў барацьбе з карупцыяй". Такая ідэя ўзнікла таму, што ў сродках масавай інфармацыі вельмі часта гаворыцца пра тое, што Магілёўская вобласць самая карумпаваная ў Беларусі. Рыгор Кастусёў адзначыў, што "магчыма так адбываецца таму, што вярхушка ўлады паходзіць з нашай вобласці і чыноўнікі на месцах лічаць, што ім усё дазволена".

На паседжанні таксама былі абмеркаваны пытанні дасягнення адзінства ў дэмакратычным руху Магілёўшчыны, тактыкі дзеянняў у далейшых дачыненнях з кіраўніцтвам агульнанацыянальных АДС.

*Барыс Вырвіч*

№41 СЬНЕЖАНЬ 2008 Выбар




## КРЫСЬЦІНУ ШАЦІКАВУ ЗЬБІЛІ ЗА АНТЫФАШЫЗМ

13 сьнежня магілёўскую актывістку Крысьціну Шацікаву зьбілі на канцэрце "Брыгадны падрад". Актывістка сьцьвярджае, што ахоўнік канцэрту моцна ўдарыў яе ў твар пасьля таго як яна выказала сваю думку наконт выступу аднаго з гуртоў. Паводле спадарыні Шацікавай, кампазыцыя гурту прапагандавала фашызм і вынішчэньне малых народаў вялікімі.

Актывістка прызнае, што парушыла парадак на канцэрце, калі забрала ў вядоўцы мікрафон, каб выказацца:

"Я проста не прымаю для сябе ні прыхільнікаў фашызму, ні самога фашызму.

Я апрытомнела ўжо ў бальніцы.

І калі я, дарэчы, ужо мікрафон аддала, падбеглі ахоўнікі і адзін зь іх мяне ўдарыў, і я страціла прытомнасьць. Ён мне патрапіў у брыво. Я апрытомнела ўжо ў бальніцы", — зазначае Крысьціна Шацікава.

Ад шпіталізацыі актывістка адмовілася. Паводле яе, арганізатары цяпер распаўсюджваюць праз інтэрнэт чуткі, што яна наркаманка й што мэдыкі гэта нібыта пацьвердзілі:

"Мне давялося сёньня падняцца на ногі. Я паехала ў наркалёгію й атрымала даведку пра тое, што я не зьяўляюся ні алькаголікам, ні наркаманам".

Актывістка зьбіраецца падаваць скаргу ў міліцыю на арганізатараў канцэрту з тым, каб прыцягнуць іх да адказнасьці.

*Радыё Свабода (Магілёў)*

# Доцент «заминировал» Белорусскую сельхозакадемию

Шутка доцента Белорусской государственной сельскохозяйственной академии (г. Горки) о минировании учебного корпуса вуза обернулась эвакуацией 400 студентов и преподавателей, сообщили в отделении информации и общественных связей УВД Могилевского облисполкома.

Выходя из учебного корпуса, 58-летний доцент кафедры психологии БСХА сказал женщине-вахтеру, что здание заминировано. Но женщина не узнала преподавателя и приняла его за неизвестного.

Вахтер немедленно сообщила о минировании здания начальнику хозяйственного отдела академии, а тот позвонил в милицию. В учебное заведение прибыла группа разминирования, следственно-оперативная группа райотдела милиции и специалисты МЧС. Взрывное устройство обнаружено не было. Как установила следственно-оперативная группа, доцент просто пошутил над вахтером.

Процессуальных решений по данному факту пока не принималось, проводится проверка, отметили в УВД.



ТОТ САМЫЙ ЧЕТВЁРТЫЙ КОРПУС

# "Народная Воля" і "Наша Ніва" заклікаюць падпісацца

Рэдактары гэтых выданьняў заклікаюць людзей не пакладацца на шапікі "Белсаюздруку" і афармляць падпіску. Чаму?

Дазвол на вяртаньне недзяржаўных выданьняў у шапікі "Белсаюздруку" і ў падпісныя каталёгі быў даволі нечаканы, таму рэдакцыі не пасьпелі правесьці рэклямныя кампаніі. Тым ня менш, ў Менску купіць газэты праблематычна. Да прыкладу, у сталіцы ў шапікі трапляе 2500 экзэмпляраў «Народнай Волі » і 1400 асобнікаў "Нашай Нівы". Выданьні разыходзяцца імгненна. Таму рэдактары газэт раяць аформіць падпіску:

Шэф-рэдактар "Народнай Волі" Сьвятлана Калінкіна кажа:

калі чалавек аформіў падпіску, ён можа быць упэўнены, што газэту

атрымае

"Вось гэта адзін з аргумэнтаў. Трэба падпісвацца на "Народную Волю", каб заўсёды быць упэўненым, што будзеш ведаць сапраўдную інфармацыю, неангажаваную інфармацыю і актуальную інфармацыю. Што тычыцца пошты і падпіскі, калі чалавек аформіў падпіску, ён можа быць упэўнены, што газэту атрымае. А што тычыцца шапікаў, то яны замаўляюць столькі, колькі хочуць. І таму ўсе ведаюць, што, да прыкладу, у Менску, у дзень выхаду газэты ў абед у бальшыні шапікаў яе няма. Але ў той жа час "Белсаюздрук" не паўлічвае наклад, які ён бярэ на продаж. Гэта дзяржаўная структура, і яна, як я разумею, кіруецца нейкімі іншымі аргумэнтамі, а не эканамічнай выгадай. Таму падпіска – гэта найбольш надзейны спосаб атрымоўваць газэту".

Кошт падпіскі на "Народную Волю" для прыватных асобаў – 9500 рублёў на месяц, на 3 месяцы – 28500 рублёў, на паўгода – 57 тысяч. Для юрыдычных асобаў крыху даражэй – 22 тысячы на месяц.

Шэф-рэдактар "Нашай Нівы" Андрэй Скурко таксама раіць падпісацца на газэту і прыводзіць наступныя аргумэнты:

Наша Ніва

Народная Воля

у "Нашай Ніве", у "Народнай Волі" можна пачуць голас незалежнага грамадзтва

"Чаму варта падпісвацца на незалежную прэсу? Таму што незалежныя газэты друкуюць тыя матэрыялы і ўздымаюць тыя праблемы, якія не гучаць у дзяржаўнай прэсе і якія не асьвятляюцца афіцыйным тэлебачаньнем. Таму што ў незалежнай прэсе, у прыватнасьці, у "Нашай Ніве", у "Народнай Волі" можна пачуць голас незалежнага грамадзтва, голас той часткі грамадзтва, якая арыентаваная на эўрапейскія каштоўнасьці".

8 тысяч каштуе падпіска на 1 месяц на "Нашу Ніву".

Сталы чытач "Народнай Волі" і "Нашай Нівы", лекар-нэўроляг з Магілёву Васіль Аўраменка выказаў пажаданьне ўсё ж такі рэдакцыям падумаць пра PR-кампанію. Ягоны аргумэнт – моладзь, асабліва ў рэгіёнах часьцяком ня ведае пра зьяўленьне недзяржаўных выданьняў:

"На мой погляд, перш чым пайсьці ў шапікі, зноў вярнуцца, так бы мовіць, у шырокае кола, трэба было б прэзэнтаваць, нагадаць шырокаму колу грамадзкасьці пар сябе. Трэба было б зладзіць нейкія PR акцыі, "прамоўшн"акцыі – варта было б пра гэта рэдакцыям падумаць".

Падпісны індэкс "Народнай волі" ў каталёгу "Белпошты" 63222, а "Нашай нівы" 63125.

*Іна Студзінская*

## НЕМЕЦКИЕ СМИ: ЛУКАШЕНКО ЗАПРЕТИЛ ДЕТЯМ ЕЗДИТЬ В ЕВРОПУ, ЧТОБЫ ИЗБАВИТЬ ИМИДЖ СТРАНЫ ОТ ЧЕРНОБЫЛЯ

Запрет Александра Лукашенко на поездки белорусских детей в западные страны связан с его стремлением разорвать связь между Беларусью и катастрофой Чернобыля.

Так объясняет жесткий курс белорусского лидера председатель объединения "Германия - детям Чернобыля" пастор Буркхард Хомайер, чье мнение приводит немецкая газета Suddeutsche Zeitung.

Декрет номер 555, закрывший дорогу в западные страны многим тысячам белорусских детей, был подписан Лукашенко после скандала с Татьяной Козыро. Несовершеннолетняя белоруска, в рамках акции "Дети Чернобыля" отправившаяся в США, отказалась возвращаться на родину, напоминает немецкое издание.

Лукашенко заявлял, что Запад "развращает" белорусскую молодежь. Однако, как считает немецкая Suddeutsche Zeitung, его решению есть и другое объяснение: Минск хочет построить собственную АЭС, но для Европы Беларусь навсегда связана с чернобыльской катастрофой, и об этом напоминает каждый приезжающий на Запад ребенок.

В одной лишь Германии, напоминает автор статьи Катрин Кальвайт, с 1994 года побывало 170 тысяч детей, которые приезжали туда, чтобы поправить свое здоровье, ухудшившееся из-за последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС 1986 года.

По мнению Хомайера, Лукашенко хочет разорвать эту ментальную связь. Это и есть одна из причин появления декрета: "во благо имиджа страны, но за счет ее детей".

№41 СЬНЕЖАНЬ 2008 Выбар

# Пять мифов о «загибающейся» американской экономике

УЖЕ НЕ ПЕРВЫЙ МЕСЯЦ ПРАКТИЧЕСКИ ВСЕ ГАЗЕТЫ США ПОТЧУЮТ СВОИХ ЧИТАТЕЛЕЙ НЕКРОЛОГАМИ ЭКОНОМИКЕ СТРАНЫ.

Журналисты и эксперты предупреждают о том, что многолетнее глобальное доминирование Америки подошло к концу. Причиной тому - такие развивающиеся рынки, как китайский и индийский, а также наши собственные бесхозяйственность и неумеренность вкупе с близоруким подходом к будущему. Давно уже пора сопоставить эти панические заявления с реальностью. Перед Соединенными Штатами и новой администрацией Обамы стоят огромные вызовы, но страна вовсе не находится на последнем издыхании. Вот главные мифы, которые необходимо разрушить.

## 1. СОЕДИНЕННЫЕ ШТАТЫ ПОТЕРЯЛИ СВОЕ КОНКУРЕНТНОЕ ПРЕИМУЩЕСТВО.

Ничего подобного. Почти по любым критериям Соединенные Штаты продолжают обгонять все страны мира (в том числе, растущие гиганты Китай и Индию) в таких областях, как инновации, технологии, высшее образование, квалификация работников, мобильность рабочей силы и так далее. Минувшей осенью Всемирный экономический форум со штаб-квартирой в Швейцарии издал свой новейший доклад по глобальной конкурентоспособности, и Соединенные Штаты вновь возглавили его список. В исследовании отмечено, что, несмотря на нынешние финансовые потрясения, Соединенные Штаты отличаются высокой производительностью труда и способны легче, чем другие страны, ‘переживать сдвиги бизнес-циклов и экономические шоки’.

## 2. СОЕДИНЕННЫЕ ШТАТЫ ДАВНО УСТУПИЛИ КИТАЮ ПАЛЬМУ ПЕРВЕНСТВА В ПЛАНЕ ОБЪЕМА ПРОИЗВОДСТВА.

Пока еще нет. Да, осенью объем производства в США резко сократился, и, действительно, отечественная автомобильная промышленность - олицетворение стареющей производственной инфраструктуры Америки - никогда не вернется к объемам десятилетней давности. Но, несмотря на все эти мрачные новости, Соединенные Штаты продолжают лидировать по объему производства - в особенности, в таких важнейших секторах, как фармацевтика и авиакосмическая промышленность, где, по данным Всемирного банка, на их долю приходится почти 25 процентов мирового объема. Китай производит около двух третей этого объема, и в последние несколько месяцев мировой экономический спад сильно ударил по его производственному сектору. Безусловно, Китай и Индия сокращают разрыв, но, если американская промышленность, администрация Обамы и Конгресс проявят творческий подход, видение и решимость, то мы сможем сохранить позиции.

## 3. СКОРО КИТАЙСКАЯ ЭКОНОМИКА ЗАТМИТ АМЕРИКАНСКУЮ

Не в ближайшем будущем. По оценкам Всемирного банка, в прошлом году глобальный ВВП составил более 56 триллионов долларов. На долю Соединенных Штатов пришлось почти 14 триллионов (или 25 процентов) этой суммы. На долю всей китайской экономики - чуть более 3 триллионов.

Конечно, Китай и другие страны - такие, как Индия и Бразилия -растут гораздо быстрее, чем Соединенные Штаты, но, как бы то ни было, мы все равно богаче. Будем реалистичны. Потрясения на финансовых рынках снизят ВВП США в 2008 и 2009 гг., но сократится и китайская экономика. Как бы вы ни рассчитывали прогнозы роста, если посмотреть на дело реалистически, то США окажутся в пределах досягаемости Китая не ранее, чем через несколько десятилетий.

Не рассчитывайте и на то, что вскоре нас обгонят остальные подающие надежды экономики. Несмотря на большие темпы роста, экономика Бразилии примерно равна по объему экономикам Флориды и Иллинойса вместе взятым. Экономика России, расположенной в 11 часовых поясах и обладающей богатыми природными ресурсами, в прошлом году была сравнима с техасской. Даже объем ВВП Индии, которая уже почти десять лет ярко светит на экономическом небосклоне, по-прежнему более, чем в два раза, ниже чем у Калифорнии. Действительно, однажды все эти страны станут экономическими гигантами, до этого им еще идти и идти.

## 4. СОЕДИНЕННЫЕ ШТАТЫ БОЛЬШЕ НЕ ЯВЛЯЮТСЯ ЭКОНОМИЧЕСКИМ МОТОРОМ МИРОВОЙ ТОРГОВЛИ

Неверно. Уже тридцать лет у нас огромный торговый дефицит, составляющий триллионы долларов и продолжающий расти, но, тем не менее, американские потребители в значительной мере способствовали росту экономик большинства стран мира.

Разумеется, если речь идет об импорте, то Соединенные Штаты покупают за рубежом гораздо больше товаров, чем Китай или Германия. Но в плане экспорта эти три страны находятся в одной весовой категории - у каждой из них его объем составляет более 1 триллиона долларов. Ни сегодня,

ни в ближайшем будущем не появится страны, которая могла бы обогнать Соединенные Штаты по своей покупательной способности.

### 5. СОЕДИНЕННЫЕ ШТАТЫ БОЛЬШЕ НЕ ЯВЛЯЮТСЯ ПРИВЛЕКАТЕЛЬНЫМ РЫНКОМ ДЛЯ ИНВЕСТИЦИЙ.

Сомнительно. Здесь инвестиции прозрачны, хорошо защищены и традиционно прибыльны. Поэтому, даже несмотря на сумятицу на Уолл-стрит, Соединенные Штаты остаются отличным местом для инвестиций. Конечно, именно здесь было положено начало нынешнему кризису ликвидности, но за последние несколько недель американский доллар резко вырос в цене, а иностранные инвесторы бросились к американским инвестициям и финансовым инструментам как (относительно) безопасной гавани в мире глобальной неопределенности. Неудивительно, что, по данным Всемирного банка и Международного валютного фонда, в прошлом году Соединенные Штаты привлекли более 2 триллионов прямых иностранных инвестиций (в Великобританию, Гонконг и Францию, следующими за США, поступило примерно по триллиону),

Каков же сухой остаток? Как недавно заметил Уоррен Баффет (Warren Buffett), американская экономика, ранее дававшая небольшую течь, выбросила мощный фонтан. Но, принимая во внимание нашу историю и уникальную способность к адаптации, мы вовсе не в безнадежном состоянии. Мир изменился, и Соединенные Штаты должны более проворно реагировать на жесткие реалии глобальной взаимозависимости. Но как напоминает нам ‘мудрец из Омахи’, сейчас самое время инвестировать в долгосрочное будущее Америки - не из слепого патриотизма, а потому, что этого требует трезвый экономический расчет.

*Джеймс Мур-мл. - профессор бизнес-школы Макдоно (McDonough School of Business) при Джорджтаунском университете и директор Инициативы ‘Глобальное лидерство’ (Global Leadership Initiative) под эгидой школы.*
*Перевод: Иносми.ру*

# Продавцов дисков обяжут продавать идеологически правильные фильмы

Слонимским предпринимателям, которые продают киновидеопродукцию, необходимо включить в свой ассортимент не менее 20 фильмов, перечисленных чиновниками по поручению Александра Лукашенко.

Среди них: «Государственные символы Республики Беларусь» и «Анатоль» -- фильм-портрет о художественном руководителе ансамбля «Сябры» Анатолии Ивановиче Ярмоленко, пишет «Салідарнасць».

На днях частным предпринимателям Слонима, которые занимаются продажей киновидеопродукции, пришло письмо за подписью начальника отдела торговли и бытовых услуг управления экономики Слонимского райисполкома, сообщает в своей статье корреспондент «Газеты Слонимской» Сергей Васильев.

«Во исполнение пункта 7 протокола поручений Президента Республики Беларусь Лукашенко А.Г. от 6 октября 2008 года №32 Вам необходимо внести дополнения в ассортиментный перечень, предусмотрев наличие производства РУП «Белорусский видеоцентр» в количестве не менее 20 видов, в срок до 20 декабря 2008 года», -- говорится в документе.

Примечательно, что срок выполнения данного поручения выпадает аккурат на день белорусского кино, который отмечают 17 декабря.

А вот и список продукции, предлагаемый РУП «Белорусский видеоцентр»:

1. Государственные символы Республики Беларусь (гимн, герб, флаг).
2. Минск — моя столица.
3. Города Беларуси (Мир, Несвиж, Каменец, Гродно, Новогрудок, Коложская церковь).
4. Республика Беларусь.
5. Цикл «Белорусский народный календарь» (Сёмуха, Щедры вечер, Никола зимний).
6. Цикл «Белорусский народный календарь» (Пасха, Радуница, Дзяды, Купалле).
7. Палитра памяти (Великая Отечественная война 1941-1945 гг. на полотнах белорусских художников).
8. Святыни Белорусской земли: Хатынь, Брестская крепость.
9. Колас вечно будет жить. Музей Я.Коласа.
10. Анатоль (фильм-портрет народного артиста Беларуси, художественного руководителя ансамбля «Сябры» Анатолия Ивановича Ярмоленко). (Не путать с Анатолем-младшим— Авт.).
11. Обелиски ф. 1-4.
12. Обелиски ф. 5-8.
13. Янка Купала. Музей Я.Купалы.
14. Серафим, Серафимовы братья.
15. По имени житие (Филарет, Митрополит Минский и Слуцкий Патриарший Экзарх всея Беларуси).
16. Сборник «Чернобыльские джунгли. 20 лет без человека».
17. Сборник научно-популярных фильмов для детей «Почему у бобра поцарапан нос?», «Лесные прятки», «Жабы на дорогах».
18. Игорь Лученок. Мелодия судьбы.
19. Сборник «Аисты Ровбицка», «Последние орлы».
20. Белорусская государственная филармония 70 лет «Открытый сезон».

Слонимские чиновники также сообщают в своем письме, что о состоянии торговли данной продукцией предприниматели должны ежеквартально информировать отдел торговли и бытовых услуг управления экономики райисполкома. «Не позднее 1 числа месяца, следующего за отчетным периодом», -- подытоживают они.

№41 СЬНЕЖАНЬ 2008 Выбар

# Спрэчкі вакол АЭС

Прыхільнікі Руху “За Свабоду” з розных рэгіёнаў Магілёўшчыны падпісалі зварот да кіраўніцтва краіны з патрабаваннем адмяніць рашэнне пра пабудову станцыі і вырашылі далучыцца да збору подпісаў пад зваротам у сваіх рэгіёнах.

6 снежня у Магілёве Горацкая антыядзерная група арганізавала рабочую сустрэчу грамадскіх актывістаў і прыхільнікаў Руху “За Свабоду” з Асіповічаў, Бялынічаў, Бабруйску, Крычава, Клімавічаў, Касцюковічаў, Клічава і Чэрыкава.

Удзельнікі абмеркавалі магчымыя наступствы пабудовы атамнай станцыі ў Беларусі. Бальшыня адзначыла, што ўлады, фактычна, на ўсіх этапах адсунулі грамадскасць ад абмеркавання падрыхтоўкі да будаўніцтва АЭС.

Удзельнікі рабочай сустрэчы падтрымалі зварот Горацкай антыядзернай групы да кіраўніцтва краіны з патрабаваннем адмяніць сваё рашэнне па будаўніцтву станцыі, а таксама вырашылі далучыцца да збору подпісаў пад гэтым зваротам у сваіх рэгіёнах.

Таксама ўдзельнікам была прэзентаваная інфармацыйная брашура “Міфалогія мірнага атаму”. У ёй горацкі журналіст Эдуард Брокараў паспрабаваў сабраць інфармацыю, якая разбурае асноўныя міфы пра карысць атамнай энергетыкі. Аўтар паспрабаваў адказаць на пытанні: наколькі танная электрычнасць ад АЭС, ці ёсць альтэрнатыва атамная энергетыцы, ці сапраўды ўмацуе АЭС энергетычную незалежнасць Беларусі. Пры падрыхтоўцы брашуры былі выкарыстаны матэрыялы СМІ, міжнароднай канферэнцыі “Экалагічная бяспека – аснова нацыянальнай бяспекі” (г.Кіеў), навуковых працаў прафесараў Г.Лепіна і І.Нікітчанкі.

Вечарам у Шклове ўжо было сабрана 100 подпісаў. Жыхары гораду актыўна падпісваліся, выказвалі сваё негатыўнае стаўленне да рашэння збудаваць атамную станцыю, было некалькі кватэраў, дзе падпісаліся цэлымі сем’ямі. Людзі казалі, што сумняваюцца, што станцыю будзе такой бяспечнай, як пра гэта распавядаюць па тэлебачанні і ў газетах. Таксама многія ўзгадвалі наступствы аварыі на ЧАЭС, казалі, што за электрычнасць лепей плаціць грашыма, а не здароўем сваіх дзяцей.

Усяго ў Магілёўскай вобласці ўжо сабрана болей за 4000 подпісаў.

---

“Астравецкая атамная — гэта злачынства!” - пад такім лозунгам збіраюцца правесці мітынг у цэнтры горада праціўнікі будаўніцтва Атамнай Электрастанцыі ў вёсцы Міхалішкі астравецкага раёну. Да мясцовых уладаў была накіраваня заяўка на правядзенне пратэстаў 27-га снежня.

Спрабуючы перадухіліць будаўніцтва атамнай электрастанцыі на Астравецкай зямлі, грамадскія актывісты найперш прыгадваюць наступствы чарнобыльскай катастрофы, якая выклікала смяротныя захворванні ў тысячаў чалавек. Аднак маштабныя даследаванні глебы ля вёскі Міхалішкі, што на Астравеччыне, цягнуцца ўжо не першы месяц.

ТАПОГРАФ:

“Тут самая аптымальная пляцоўка. 95%, што АЭС паўстане тут”.

Незалежныя ж даследнікі прытрымліваюцца супрацьлеглага меркавання.

МІКОЛА УЛАСЕВІЧ, ГЕОГРАФ:

“У 1909 годзе тут адбыўся даволі магутны землятрус – 6–7 балаў. Утварыўся лакальны разлом глебы – недалёка ад вёскі Гудагай. Па геаграфічных мерках, гэта вельмі блізка ад пляцоўкі будаўніцтва. Гэта сведчыць аб тым, што крышталічны фундамент тут вельмі слабы”.

Географы дадаюць, што мясцовая ружа вятроў можа паспрыяць распаўсюду радыяцыі па ўсёй тэрыторыі краіны. З іхных словаў, першаю ахвярай выкідаў электрастанцыі могуць стаць ваколіцы Нарачанска-Вілейскай запаведнай зоны. Але мясцовыя чыноўнікі сцвярджаюць, што праца рэактару не ўтворыць экалагічнай пагрозы.

ГЕНРЫХ ЧАСНОЙЦЬ, СТАРШЫНЯ МІХАЛІШКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ:

“Шкоды ад яе аніякай не будзе для здароўя людзей, таму ўсе людзі настроеныя вельмі станоўча. Шмат для каго адкрыюцца новыя працоўныя месцы, і, канечне, інфраструктура зменіцца – будуць пабудаваныя новыя жыллёвыя месцы”.

Але далёка не ўсе мясцовыя жыхары ўпэўненыя, што атрымаюць магчымасць працаўладкавання.

МЯСЦОВЫ ЖЫХАР:

“Ёсць размовы, што мясцовых браць не будуць. Што будуць браць прыезджых – расіянаў. Я згодны. Дзе ж у нас спецыялісты?”

Пакуль частка насельніцтва спадзяецца на выгоды, якія можа стварыць будаўніцтва рэактару, грамадскія актывісты спрабуюць прадухіліць яго пачатак. Свае звароты яны ўжо накіравалі ў дзяржаўныя органы, сродкі масавай інфармацыі ды ў шэраг Еўрапейскіх структураў. Дазволу на правядзенне вулічных акцыяў пратэстоўцы пакуль не атрымалі.

*Юлія Цяльпук, “Аб’ектыў”*



# Подпісы супраць АЭС

Жыхары Астравецкага раёна збіраюць па ўсёй Беларусі подпісы аб недапушчэнні пабудовы Астравецкай атамнай электрастанцыі.

- Мы маем намер накіраваць сваю заяву і подпісы ва ўпраўленне справамі прэзідэнта, у Акадэмію навук Беларусі, у Еўрапейскі Саюз і МАГАТЭ, а таксама ў сродкі масавай інфармацыі, - паведаміў актывіст Руху “За Свабоду”, адзін з арганізатараў збору подпісаў Іван Крук.

“Мы катэгарычна не жадаем пераўтварэння нашага ўнікальнага запаведна-рэкрэацыйнага Нарачанска-Віленскага краю ў яшчэ адну “чарнобыльскую дзірку” на карце Еўропы.<...> Мы рашуча заяўляем, што атамная электрастанцыя не можа быць пабудавана ў самай сейсманебяспечнай зоне нашай краіны, якой з’яўляецца Астравецкі раён. Бо менавіта тут на мяжы 1908 -1909 гадоў адбыўся самы значны за ўсю гісторыю назіранняў землятрус на тэрыторыі Беларусі сілай ў 7 балаў <...>” – гаворыцца ў заяве.

Арганізатары кампаніі заклікаюць усіх, каму неабыякавы лёс Беларусі, далучыцца да ініцыятывы.

# Конкурс творчых працаў “Правы чалавека - гэта...”

У дзень правоў чалавека Прадстаўніцтва ААН у Беларусі сумесна з рэспубліканскім праваабарончым грамадзкім аб’яднаньнем “Беларускі Хэльсінскі Камітэт” абвесьцілі аб правядзеньні конкурсу творчых працаў (малюнкаў, калажаў, фатаздымкаў і т.п.) “Правы чалавека - гэта....”.

Мэты конкурсу - пашырэньне ведаў і разуменьня палажэньняў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, агучаных у ей каштоўнасьцяў ды прынцыпаў павагі, абароны правоў чалавека сярод дзяцей і моладзі (да 21 году), прыцягненьня ўвагі да праблемы правоў чалавека ў сучасным сьвеце.

Удзельнікам конкурсу прапануецца ў мастацкай форме працягнуць фразу “правы чалавека - гэта....” - адлюстраваць сваё разуменьне таго, што такое правы чалавека ў цэлым (альбо асобныя свабоды) і што яны значаць у жыцьці.

Аўтарскія працы мусяць быць дасланыя па адрасе Прадстаўніцтва ААН у Беларусі: 220030 Менск, вул. Кірава, 17, 6 этаж) з пазнакай на капэрце “Конкурс ВДПЧ”. Да графічных працаў неабходна прыкласьці інфармацыю аб канкурсанце (Поўнае імя, нумар тэлефону, паштовы адрас і адрас эл.пошты, назву навучальнай установы) і кароткае тлумачэньне мастацкай задумкі.

Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаныя прызамі і дыплёмамі. Лепшыя працы будуць апублікаваныя ў выглядзе плякатаў і разьмешчаныя на сайце Прадстаўніцтва ААН www.un.by і РПГА “Беларускі Хэльсінскі Камітэт” www.belhelcom.org. Арганізатары конкурсу пакідаюць за сабой права далейшага выкарыстаньня конкурсных працаў з пазначэньнем імёнаў аўтараў у асьветніцкай ды іншай дзейнасьці па прасоўваньні і абароне правоў чалавека.

Цырымонія ўзнагароджаньня пераможцаў конкурсу адбудзецца ў канфэрэнц-залі Прадстаўніцтва ААН у Менску 16 лютага 2009 г., у гадавіну стварэньня Камісіі ААН па правах чалавека.

Апошні тэрмін падачы аўтарскіх працаў: 1 лютага 2009 году.

За дадатковай інфармацыяй зьвяртайцеся да Уладзімера Шчарбака, дарадцы Прадстаўніцтва ААН у Беларусі (2274876, 6511527).

# На Новы год дазволяць купляць спіртное пасля 21.00

Ідучы на сустрэчу пажаданням “працаўных” 4 снежня Магілёўскі аблвыканкам выдаў распараджэнне № 323-р у адпаведнасці з якім 31 снежня 2008 года і 6 студзеня 2009 года дазваляецца продаж алкагольных напояў у Бабруйску пасля 21.00.

У распараджэнні аблвыканкама гаворка ідзе аб дарагіх спіртных напоях: віскі, каньяку, шампанскім, вінах і.г.д. Продаж гэтых напояў будзе адбывацца ў перыяд поўнага рэжыму працы аб’ектаў гандлю і грамадскага харчавання.

# В Китае создана Хартия'08

10 декабря, в День прав человека, более 300 китайских интеллектуалов и правозащитников опубликовали документ под названием «Хартия'08».

Китайские демократы потребовали провести в стране конституционную реформу, а также ввести многопартийную систему и главенство закона.

The Financial Times усматривает в этом "признак растущего недовольства стратегией китайской компартии, состоящей из поощрения экономической реформы без сколь-нибудь значимой либерализации в политической сфере".

Как сообщает газета, петиция пользуется широкой поддержкой среди китайской интеллигенции. Некоторые подписанты прямо говорят, что их вдохновила знаменитая "Хартия 77", принятая более 30 лет назад в Чехословакии.

Как и ее прототип, "Хартия 08" не призывает к свержению существующего строя, а ее оргкомитет не стремится оформиться в политическую партию. Тем не менее, сам "факт, что несколько сотен интеллектуалов открыто поддерживают данную инициативу, обязательно будет воспринят КПК как вызов, - пишет The Financial Times. – Список подписавших "Хартию 08" выглядит как справочник "Кто есть кто в среде китайских диссидентов и либеральных мыслителей".

Напомним, что белорусская Хартия'97 была создана 10 ноября 1997 года по инициативе журналистов независимых СМИ. Первыми Хартию подписало 100 наиболее известных белорусских правозащитников, ученых, писателей, общественных деятелей, а также журналисты независимых изданий. Они обратились к гражданам Беларуси с призывом подписать документ - Хартию'97, целью которой является сделать Беларусь свободным, суверенным и процветающим европейским государством, где соблюдаются права человека, где нет политзаключенных, где каждый гражданин может рассчитывать на достойный уровень жизни.

***Хартия 97***

# Минлесхоз собирается продать...

В преддверии новогодних праздников предприятия Министерства лесного хозяйства планируют реализовать населению около 150 тыс. новогодних елей, сообщила БелаПАН руководитель пресс-службы Минлесхоза Ружена Новицкая.

По ее словам, реализация елей будет организована с 20 декабря во всех областных, районных центрах, а также в самих лесхозах. "Дефицита живой новогодней ели в текущем году, как и в прошлые годы, не будет", — подчеркнула руководитель пресс-службы. В настоящее время на специальных плантациях лесхозов насчитывается более 400 тыс. штук новогодних елей, годных к реализации, добавила она.

Кроме того, заготовка елей может осуществляться и при проведении рубок ухода за лесом (из числа деревьев, вырубаемых в соответствии с лесоводственными требованиями), а также в порядке расчистки трасс, просек, полос отвода, линий электропередачи, на лесосеках главного пользования и сплошных санитарных рубок.

Р.Новицкая сообщила, что ориентировочная цена на ель новогоднюю на базарах лесхозов в 2008 году составит: высотой до 1 м — от 4,8 тыс. до 10 тыс. рублей, 1,1—2 м — от 7,3 до 13,3 тыс.рублей, 2,1—3 м — от 8,5 до 18,3 тыс. рублей. В некоторых лесхозах Брестской и Минской областей готовы к реализации новогодние ели в кадках. Их стоимость колеблется от 15 до 52 тыс. рублей.

По словам Р.Новицкой, на елочных базарах лесхозов также можно будет приобрести новогодние букеты по цене до 3 тыс. рублей. "Букеты изготавливаются из свежесрезанных ветвей хвойных пород (ели, сосны и др.). При изготовлении их могут использоваться хвойные ветки с шишками. Длина букета 250—500 мм, диаметр в месте обвязки 40—50 мм", — отметила она.

Выбар №41 СЬНЕЖАНЬ 2008
Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.
Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступленьня ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай раклямы
У нумары выкарыстаны матар'ялы сайтаў: svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.eu, uzgorak.na.by, atomby.net, charter97.org; horki.info.